# КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 26 (1725) | 27 чэрвеня 2025 г.




На фота — Мікалай Навіцкі, выпускнік БДУКМ, у Палацы Незалежнасці

9 771994 478007 25026

Дзень моладзі і студэнцтва адзначаецца ў Беларусі ў апошнюю нядзелю чэрвеня. Маладзёжная палітыка — адзін з прыярытэтных напрамкаў развіцця нашай дзяржавы.

Працяг тэмы на стар 6.

# Галоўнае правіла — шчырасць

**Кіраўнік дзяржавы 20 чэрвеня ўзнагародзіў найлепшых выпускнікоў і выкладчыкаў устаноў вышэйшай адукацыі. Сярод удастоеных Падзякі Прэзідэнта Беларусі — малады акардэаніст Мікалай Навіцкі, учарашні студэнт факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пра сцэнічныя поспехі, папулярнасць у сацыяльных сетках і планы расказвае герой рубрыкі.**



Мікалай Навіцкі

**— Мікалай, з чаго пачаўся ваш творчы шлях?**

— Аднойчы ў дзяцінстве мама спытала: "Хочаш займацца музыкай?" І я сказаў: "Так", — хаця не разумеў, як гэта паўплывае на маё далейшае жыццё.

**— І першыя крокі ў прафесію вы зрабілі...**

— У сярэдняй школе з музычным ухілам у Салігорску. Там сустрэў цудоўную настаўніцу па класе акардэона Алену Міхайлаўну Краміч, якая заўважыла мой патэнцыял, прывіла любоў да інструмента і растлумачыла, наколькі важная шчырасць у адносінах са слухачом. Мой узровень майстэрства — у значнай ступені яе заслуга. Радасна, што дагэтуль мы захоўваем цёплыя стасункі. А падчас навучання ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў і БДУКМ мне пашчасціла сустрэць яшчэ мноства выбітных педагогаў. Бясконца ўдзячны кожнаму з іх!

**— Акрамя акардэона, напэўна, валодаеце іншымі інструментамі?**

— За гады вучобы асвоіў фартэпіяна, іграў на цымбалах, на балалайцы ў аркестры. Цяпер усё часцей бяру ў рукі гітару. Падабаецца яе гучанне! На гэты інструмент рабіла стаўку і мама, калі вяла мяне на музычныя заняткі.

**— А што наконт сцэнічных поспехаў?**

— З першага курса БДУКМ выкарыстоўваў любую магчымасць праявіць сябе. Неўзабаве мяне заўважыў аддзел універсітэта па арганізацыі канцэртных і творчых праектаў "Арт-Мажор". Паступова я выходзіў на пляцоўкі больш высокага ўзроўню, далучаўся да маштабных мерапрыемстваў краіны. Паўдзельнічаў, да прыкладу, у гала-канцэрце ў гонар Дня Перамогі, святкаванні Дня касманаўтыкі ў Маскве, дзе пазнаёміўся з Марынай Васілеўскай.

**— Таксама вы ведзяце канал на Youtube з амаль 70-тысячнай аўдыторыяй...**

— Ён з'явіўся ў 2022-м, калі я вучыўся на другім курсе БДУКМ. Праект мы запусцілі разам з сябрам, які ўзяў на сябе аранжыроўкі і мантаж, а я — выкананне.

Дзейнасць распачалася з твора "Танга ночы" Пятра Дранга. Ад першага відэа нічога не чакаў. І раптам ролік сабраў больш за 370 тысяч праглядаў, а яшчэ сотні пазітыўных, шчырых каментарыяў ад людзей нават з самых аддаленых куткоў свету! Гэта ўзрадавала і падбадзёрыла нас. І цяпер вяртаюся да яго, каб натхніцца на стварэнне новага якаснага і цікавага кантэнту.

Наступным апублікавалі выкананне танга "La Cumparsita" (аўтар — Херарда Эрнан Матос Радрыгес). Цяпер гэта самы папулярны ролік, які паглядзелі больш за мільён разоў!

**— Хто з музыкантаў для вас узор?**

— Напэўна, расійскі акардэаніст-віртуоз Пётр Дранга. Ён геніяльна перадае эмацыйную атмасферу кампазіцыі, стварае сваім выкананнем нешта чароўнае. З дзяцінства люблю яго выступленні, бо мне здавалася, што ў нас падобная энергетыка.

Мяне часта параўноўвалі з гэтым артыстам, хтосьці казаў, маўляў, мы і вонкава падобныя. Нешта агульнае мо і ёсць, але ж на сцэне я паводжу сябе па-іншаму і тэхніка выканання адрозніваецца. Забаўна, што маці Пятра Дрангі заўважыла мяне ў сацыяльных сетках. Напэўна, знайшла праз той самы першы ролік на канале. Было вельмі прыемна!

**— А якія кампазіцыі ў вашым рэпертуары? Чым здзіўляеце слухача?**

— Пераважна творамі эстраднай накіраванасці. Але выконваю самыя розныя кампазіцыі, межаў няма. Галоўнае — дарэчнасць, адпаведнасць пляцоўцы і мерапрыемству. Імкнуся таксама выступаць пад уласныя мінусоўкі і аранжыроўкі, зробленыя прыяцелем, з якім мы вядзём канал.

**— Што вас натхняе і зараджае энергіяй?**

— Шчырая рэакцыя і падтрымка слухача! Мне важна бачыць эмацыйны водгук і зацікаўленасць публікі, запальваць і здзіўляць яе.

**— Што адчуваеце ў сувязі з атрыманнем Падзякі Прэзідэнта?**

— Вельмі хвалююча і радасна ўсведамляць, што я ўдастоены высокай узнагароды! Раней і падумаць не мог, што буду далучаны да ліку такіх таленавітых студэнтаў. Падзяка Прэзідэнта — велізарная матывацыя!

**— Вас таксама запрасілі на Рэспубліканскае свята "Самы лепшы выпускны". Якія ўражанні ад яго?**

— Назва кажа сама за сябе! Гэта было дзіўна і цудоўна. Спадабалася магутная энергетыка, што панавала вакол, я адчуваў моцнае яднанне з іншымі гасцямі. Пунсовыя ветразі — самы яркі і доўгачаканы момант — запомню назаўжды!

**— Калі зазірнуць у будучыню, то вы...**

— Працягну актыўную канцэртную дзейнасць. Усёй душой люблю свой інструмент і хачу папулярызаваць яго, каб як мага больш людзей далучаліся да гэтага прыгожага гучання!

Таксама пасля выпуску маю намер заняцца развіццём і прасоўваннем свайго канала на YouTube. А яшчэ буду працаваць настаўнікам у агульнаадукацыйнай школе ў аграгарадку Самахвалавічы.

**— На каго з педагогаў будзеце раўняцца?**

— Побач са мной заўсёды было шмат добрых настаўнікаў, якім я вельмі ўдзячны, і ў кожнага ёсць што пераняць. Буду развівацца, абапіраючыся на іх вопыт, на тыя рысы характару, якія дапамагаюць эфектыўна навучаць дзяцей, гадаваць культурную эліту нацыі.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ
Фота з архіва героя

# У добры шлях

**Амаль тры тысячы студэнтаў з усіх рэгіёнаў краіны аб'яднала Рэспубліканская свята "Самы лепшы выпускны".**

Распачалося яно ўвечары 20 чэрвеня на пляцоўцы каля Палаца спорту. Да маштабнага мерапрыемства пашчасціла далучыцца юнакам і дзяўчатам, якія дамагліся пэўных вышынь у акадэмічнай, грамадскай дзейнасці ВНУ, спорце, творчасці і іншых значных сферах.

Насычаная праграма ўключала кібергульні, выступленні Прэзідэнцкага аркестра, вядомых эстрадных выканаўцаў Беларусі і замежжа, танцавальных калектываў у суправаджэнні эфектнага светлавога шоу. Са сцэны гучалі шматлікія хіты сучасных музычных чартаў. І фінальны акорд — з'яўленне на Свіслачы пунсовых ветразяў, азораных грандыёзным салютам, — азнаменаваў новы жыццёвы этап таленавітай моладзі.



**Лізавета Пеганава,** выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі:

— Цікавая канцэртная праграма і прыемная кампанія зрабілі гэты вечар па-сапраўднаму святочным! Радасна было ўбачыць на сцэне аднакурсніка Кірыла Кучынскага ў складзе калектыву "Харызма". І, нягледзячы на халоднае надвор'е, усе адчувалі атмасферу цеплыні і весялосці!



**Ангеліна Сарока,** выпускніца факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, супрацоўніца РВУ "Культура і мастацтва":

— Апынуцца ў ліку запрошаных на рэспубліканскае свята — вялікі гонар і радасць! Паспрыяла гэтаму нядаўняя перамога ў конкурсе "Зорка БДУ", актыўная праца ў творчым напрамку студэнцкага савета факультэта і ўдзел у папулярным вакальным шоу "Фактар.by".

"Самы лепшы выпускны" парадаваў яркімі нумарамі вядомых артыстаў, атмасферай цеплыні і шчырасці. Да слёз уразіла шоу з ветразямі. Дзякуй за незабыўныя ўражанні!